Беларускі Звон

ТЫДНЁВАЯ ЧАСОПІСЬ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9). Рэдакцыя адчынена: 12—2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Рукапісы павінны быць напісаны чытэльна і толькі па аднэй боку паперы, з прозьвішчам [illegible] аўтара і адрасам для ведама Рэдакцыі. Непрыгодныя рукапісы назад не вартаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана кожнага нумару 50 м. Падпіска на 3 месяцы каштуе 600 м. (з даст. да хаты). Цана абвестак: перад тэкстам 700 мк., сярод тэксту 800 мк. і на апошняй страніцы 1 0 мк. за радок петыту у 1 шпальт.

Год II. | Вільня, Нядзеля, 1-га кастрычніка 1922 г. | № 23 (48).

САМІ за СЯБЕ!

У часе прадвыбарнае агітацыі па Зямлі Беларускай будзе выступаць вялікая чарга розных партыяў. Партыі гэтыя дзеляцца на дзьве групы: з аднаго боку ўсе няпольскія нацыянальнасьці йдуць дружнай грамадой, усе разам, як Блёк Нацыянальных Меншасьцей Польскага Гаспадарства (сьпісак № 16), пры чым усе партыі кожнае са зблёкованых нацыянальнасьцей аб'яднаны на аднэй нацыянальнай плятформе і паасобку не выступаюць; з другога боку выступае цэлая хмара польскіх партыяў, якія йдуць кожная асобна.

Што могуць рабіць польскія партыі на Беларускай Зямлі, сярод народу Беларускага? Вось пытаньне, якое узьнімаецца само сабой, калі бачыш доўгі сьпіс польскіх выбарных нумароў, пушчаных у нас у ход. Яно, запраўды дзіўна: што паляком рабіць у нас?

Адказ дужа просты: ўсе польскія партыі спадзяюцца, што „беларускае быдла", як яны нас называюць, гэткае цёмнае і дурное, што на выбарах будзе галасаваць не за свае, а за польскія сьпіскі. Усе яны жыруюць на нашы галасы. Гэтак робяць і эндэкі, якія адкрыта дабіваюцца зьнішчажэньня самога імя беларускага і стараюцца зруйнаваць нас эканамічна, пазбавіўшы нашае сялянства зямлі,— і рознага сорту „людовіцы", — і ўрэшце, левыя партыі, як „Вызволене" і П. П. С."

Што за правыя партыі, якія імкнуцца абеззямеліць нас і завясьці нам новы прыгон, можа галасаваць толькі той з беларусоў, хто запраўды заслугоўвае на імя „быдляці" — гэтага і даводзіць ня трэба. Яно ясна само сабой. Але справа блутаецца, калі закранем пытаньне аб „Вызволеню" ці польскіх соцыялістаў.

Пад той час, як усе беларускія дзеячы знаходзіліся пад „апекай" польскіх жандароў; як даволі было беларускаму інтэлігэнту, сыну сярмяжных бацькоў, зьявіцца ў сваей вёсцы, каб яго адтуль пад арыштам вывязла паліцыя, як беларускія часопісі, пасыланыя з места падпішчыкам, недзе па дарозе „прападалі", — у гэты час польская народніцкая партыя „Вызволене", якая мае мэту бараніць інтарэсы польскага сялянства, пачала работу ў беларускай вёсцы. Партыя гэта мела сваіх паслоў у Сойме, дык тыя свабодна раз'яжджалі па нашай зямлі, запужанай адміністрацыяй, і свабодна-ж лаялі гэту адміністрацыю. лаялі ўсіх, хто крыўдзіў і зьдзекаваўся над вёскай. Народ, які дагэтуль ня чуў такіх вольных прамоваў, горача адгукаўся на заклік запісавацца да „Вызволеня": „вызволенцы", працуючы на Беларускай Зямлі, адкінулі ў назове сваім слова „польская" партыя і тлумачылі, што іх партыя абыймае і беларускіх сялян.

Праграму сваю „вызваленцы" надрукавалі па беларуску, ды аб зямлі ў ёй панапісывалі зусім ня тое, што ў польскім выданьні. Дык нашы людзі і пісаліся ў „Вызволене", думаючы што гэта — „сваё": яны-ж і па беларуску прамаўлялі да нас!

Сьляпыя: вы ня ведалі, што польская партыя „Вызволене" руліцца толькі аб карысьць польскіх сялян, што хоча забраць для іх нашу зямліцу, якую мы потам і крывёй палівалі сотні гадоў, што „вызволенцы" сваімі галасамі ў Сойме зацьвярдзілі закон аб польскай калянізацыі ў Беларусі...,. Ня ведалі і ня ведаеце, што заявы гэтае партыі ў перадвыбарных лістоўках, быццам „Вызволене" „бароцца з несправядлівою калянізацыяй", — гэта звычайныя перадвыбарныя штукі і мана! Ня ведаеце, што „Вызволене" мае за закон аб калянізацыі эндэкаў — пястоўцаў і др., а само-ж прылажыла руку да правядзеньня яго, што за гэты закон у Сойме галасавалі ўсе чыста польскія партыі, не выключаючы „Вызволеня" і польскіх соцыялістаў!

Дык-жа ведайце гэта, людцы, — ведайце, што кожын паляк вашым коштам хоча ашчасьлівіць свой, польскі народ, што дзеля шчасьця польскага сялянства „вызволенцы" ўжо вас прадалі і будуць прадаваць! Яны добрыя ў Польшчы, каб там бароцца з польскім панствам, — і ў Сойме нам пэўне прыдзецца ісьці поруч з імі, каб разьбіваць панаваньне панства і эндэцкае чорнае сотні. Але мы ня можам і не павінны рабіць таго, да чаго нас заклікае „Вызволене": мы ня маем права аддаваць на выбарах нашы голасы не за беларусаў, а за польскіх дэмакратычна настроеных панкоў, што стаяць на першым месцы на сьпісках „Вызволеня". Праўда, на тых-жа сьпісках стаяць і імёны беларусаў. — ды стаяць яны далей, ззаду, толькі дзеля прыкрыцьця кандыдатур палякоў на першых мясцох.

Тое-ж, што мы сказалі тут аб „вызволенцах", трэба паўтарыць і аб польскіх соцыялістах. Яны добрыя датуль, пакуль працуюць на чыста польскіх прасторах, — але на нашай Зямлі мы маем даволі сваіх, беларускіх соцыялістаў і дэмакратаў, сыноў нашага народу. якія бароняць нашае і беларускае сялянства і работнікаў, якія не дапусьцяць, каб польскія дэмакраты і соцыялісты закавалі нас у путы няволі дзеля шчасьця польскіх сялян і работнікаў. І цяпер, на выбарах, калі польскія соцыялісты прыходзяць да нас па мандаты, — мы прыпомнім ім рыжскі мір, на каторым галава іх, пан Дашчынскі, разам з эндэкамі рэзаў Беларусь на часьці, а пасьля з бяспрыкладным цынізмам заяўляў беларусам: „мы вас падзялілі, бо на нашай старане была сіла!" — Няхай-жа людзі, на якіх ляжыць чорная пляма гвалту над Беларускім народам, не працягіваюць сваіх рук на беларускія галасы!

Скажам яшчэ раз: у Сойме мы пойдзем у хаўрусе з польскай дэмакратыяй, сялянамі і работнікамі, проці польскага панства, якое уціскае ў роўнай меры і іх, і нас. Але у Сойм мы пашлем **сваіх** паслоў, мы не аддамо сваіх галасоў хоць-бы найлепшым паляком. Мы пакажам, што беларусам ня трэба чужых апякуноў, бо мы самі здалеем бараніць нашы справы і паказаць усяму сьвету нашы крыўды.

Мы падамо свае галасы за той сьпісак, які уложаны Беларускім Цэнтральным Выбарным Камітэтам **пад нумарам шаснаццатым.**

Ів. Мялешка.

Беларусы! Неадкладаючы выбірайце на кожны выбарны акруг даверанных ад грамадзянства.

Зямля.

Надыходзяць выбары у новы Варшаўскі Сойм.

Стары Сойм пастанавіў, каб у нашым краі адбывалася польская колёнізацыя.

Ужо многа палякоў з Польшчы асела за гэты час дробнымі панкамі ў нашым краі.

Многа краёвага лесу сплыло за гэты час за граніцу, набіўшы грашмі кішэні паноў і багатых жыдоў,

Купілі па кавалку зямлі і некаторыя багацейшыя беларускія сяляне. Але ўвесь беларускі люд, дзеля таго, што ён у большасьці бедны і безграшавы, ня мог купіць і застаўся без зямлі.

Яшчэ і цяпер ідзець гэтая гарачка расхопліваньня нашай зямелькі, спрадвеку паліванай потам і крывёю нашых бацькоў і дзядоў.

Што-жа тымчасам робяць і гавораць у гэтай справе польскія партыі?

Усе яны галасавалі за тую „зямельную рэформу", ад якой выходзіць вялікая крыўда беларускаму народу і ад якой беднаму бнларусу-мужыку зусім ніякой карысьці няма.

Правыя польскія партыі кажуць, што паны ў нашым краі, на Беларусі—палякі, значыцца, і зямля, якую гэтыя паны посядалі — польская, і аб ніякіх беларускіх правох на яе ня можа быць жаднай размовы.

Левым польскім партыям, якія гуляюць у соцыялістаў, так казаць было не да твары. Яны горкае лякарства пасладзілі для белаусаў салодкай гутаркай. Яны кажуць, што розьніцы паміж бедным беларусам і бедным паляком рабіць ня можна. Але дзеля таго, што ў Польшчы народ жывець гусьцей, чымся ў Беларусі дык бедных палякоў трэба перасяліць на беларускую зямлю.

І вось мы на свае вочы бачым, да чаго дагаварыліся адны й другія польскія партыі. Польскія паны, прадаючы зямлю і адаючы яе пад вайсковае асадніцтва, нажываюцца. Замест вялікіх паноў, у нас, як грыбы, растуць дробныя панкі. Бедных польскіх сялян мы і ў вочы тут ня відзілі, а зямелькі як ня мелі так і ня маем.

Але надыходзяць выбары ў новы Варшаўскі Сойм. і кожная партыя, каб за яе галасавалі, мусіць паказаць сваю праграму, яна думае, што яна хоча рабіць.

Як цяпер агітуюць людзі гэтых партыі, няма што: кожны ведае.

Круцяць, муцяць, задурываюць, як на кірмашы, але аб тым, што нам найбольш баліць, аб зямельцы, ніколі шчырай праўды не гавораць і другім не даюдь гаварыць аб ёй.

І толькі адзін Беларускі Выбарны Камітэт у Вільні сказаў ясна і адкрыта, што ён думае аб зямлі і як ён хоча.

Беларускія паслы, якіх выставіць Камітэт, будуць дамагацца скасаваньня закону аб зямзі, які так крыўдзіць беларусаў і ўсіх тутэйшых людзей і пры якім ніводзін беларускі бедны селянін зямлі не дастане. Паслы, якіх ён выставіць будуць дабівацца скасаваньня крыўднай для нас польскай колёнізацыі ў нашым краі. Яны будуць дабівацца такога права, каб кожны тутэйшы селянін, ня толькі той, які мае грошы, але і самы бедны дастаў сабе кавалак панскай ці скарбовай зямлі.

Гэтая зямля ня „польская", як кажуць правыя польскія партыі, за тое толькі, што на ёй сядзеў пан-паляк і смактаў з нас астатнія сокі, як павук з мух. Гэта зямля павінна належаць таму,

хто на ёй працуе і спрадвеку працаваў. І павінен быць выданы такі справядлівы для ўсяго гаспадарства і для нас закон, каб гэтая зямля і па закону пісанаму, а ня толькі жывучаму ў нашых сэрцэх, сталася нашай.

Гэтаа зямля павінна даставацца тутэйшаму селяніну, а ня польскаму жаўнеру, бо калі гэты жаўнер праліваў кроў за Польшчу, то і наша кроў — не вада. А ці-ж мала разьлілі на гэтай зямельцы сваей крыві нашы бацькі, дзяды й прадзеды? А ці-ж мы не разьлівалі сваю кроў і ў гэтую вайну, пасьля якой паўстала Польшча? Каб ня было вайны і рэвалюцыі, то і Польшчы яшчэ ня было-б. Дык чаму гэта для другіх „мір без анэксій і контрыбуцый і з самаазначэньнем народаў", а беларусам — кукіш пад нос? Гдзе праўда і справядлівасьць? Чаму наша кроў ня лічыцца за кроў, а за якуюсь юшку? Калі вайна і рэвалюцыя дала новае права, дык яно належыцца і нам. Беларускі народ сам па сабе нікім не зваяваны. І калі нават да немцаў антанта мае нейкую літасьць, то чаму якраз наша зямелька павінна пайсьці на ахвяру польскаму жаўнеру за яго кроў? Праўда, мы цяпер у межах Польшчы, але-ж цяпер ўва ўсім сьвеце няма й такога права, каб адну часьціну гаспадарства, з адным насяленьнем, аддаваць на ахвяру другой часьціне, з іншым насяленьнем.

Гэткі наш адказ польскай правіцы і польскаму цэнтру.

А польскай лявіцы нават брыдка адказаць. Калі яны запраўды социялісты, то не павінны глядзець на беларусаў, як на горшы гатунак бедных людзей. У нас зямелькі — дай Бог каб самім хапіла! Дык ці-ж ня сорам галасаваць за такі закон, каб на нашай зямельцы пасадзіць нібы-та бедных польскіх сялян?! А яны галасавалі! У жабрака адбіралі кавалак хлеба і прыкрываліся социялізмам, роўнасьцю. Не, гэта не социялізм, а самы нягодны прытоены зьвярыны нацыялізм.

Вось, браты, беларусы і ўсе тутэйшыя людзі! Агітатары і правых і левых польскіх партый ня хочуць з вамі пагаварыць аб гэтай справе. Бо ім няма чаго сказаць тут, каб пацягнуць вас за сабою. „Вызваленцы", дык тыя пачалі нават дзели гэтага пад беларускую скуру падрабляцца, як ваўкі пад авечую. Пачалі перацягіваць да сябе на службу безработных беларусаў, слабейшых духам і розумам. „Вызвалэнцы" забыліся на прыказку: „А скінь, дзярадзею, скурку, бо зубкі тырчаць!"

Помніце, браты беларусы і ўсе тутэйшыя людзі! У зямельнай справе толь- Беларускі Выбарны Камітэт запраўды бароніць вашы інтарэсы, як і ўва ўсіх іншых справах. Але ў другіх справах дзеля селяніна, можа быць, ня ўсё так ясна і зразумела, як у справе зямлі.

Дык глядзіце-ж, каб вас не ашукалі. Падумайце, разьмяркуйце і ведайце, за каго вам галасаваць, каб мець запраўкарысьць ад сваіх паслоў у Варшаўскім Сойме.

Такімі пасламі будуць толькі выстаўленыя вашым Беларускім Выбарным Камітэтам у Вільні.

N.

Памятайце, што трэба галасаць за № 16 і скажыце аб гэтым другім.

Даверанныя ад грамадзянства

(„mężowie zaufania").

Пры падачы акружнога сьпіску кандыдатаў, які павінен быць падпісаны ня менш, як 50 выбаршчыкамі акруга, гэтыя падпісаўшыя павінны тут жа выбраць свайго паўнамоцніка па гэтаму сьпіску. Паўнамоцнік гэты будзе бараніць інтарэсы сьпіска па ўсіх Акружных Камісіях (ст. 47).

Але, зразумела што інтарэсы нашага сьпіску, нашу справу прыйдзіцца бараніць і ў кожным Абводзе. Дзеля таго закон дае права гэтаму паўнамоцніку акружнога сьпіска назначаць сваіх даверанных дзеля абароны інтарэсаў гэтага сьпіска ў ваўсіх Абводавых Камісіях (т. 63).

Вось яны і ёсьць так назыв. давераныя ад грамадзянства („mężowie zaufania").

Гэтыя даверанныя ад грамадзянства будуць ўпушчаны разам з сябрамі Абводавых Камісіі ў памешканьне Камісіі у найважнейшы момэнт выбарнага часу, у дзень галасаваньня (ст. 63).

Разам з сябрамі Камісіі гэтыя давераныя ад грамадзянства будуць сядзець у час галасаваньня за адным сталом, пераглядываць кожны канвэрт бачыць кожнага выбаршчыка, бачыць як правільна старшыня і сябры Камісіі выпаўняюць сваю найважнейшую працу— быць справедлівымі і акуратна, ня гледзючы на асобу, выпаўняць роўныя для усіх прадпісаньні закону (ст. 73).

Разам з сябрамі Камісіі давераныя ад грамадзянства павінны пракананацца, што выбарная урна — пустая. Урна гэта ёсьць закрыты на ключ яшчык, у які кідаюцца картачкі галасаваньня (ст. 69).

Давераныя ад грамадзянства маюць права аднолькова з сябрамі Камісіі застанавіць падачу голаса кожнага выбаршчыка, асобу якога яны лічаць падазрэннай і правы спрэчныя. Тады да выясьненьня пытаньня старшыня не дапускае да галасаваньня падазрэннага выбаршчыка (ст. 75 п. 1).

Наадварот, у выпадку няпэўнасьці з боку іншых, давераны ад грамадзянства павінен паклапаціцца знайсьці другога сьведку, лічучы першым самаго сябе, каб падцьвярдзіць, што падазрэнная асоба ёсьць поўнамоцны выбаршчык (ст. 75 п. 2).

Пры абавязковай прысутнасьці давераных ад грамадзянства падлічаюцца галасы у урнах пасьля выбараў (ст. 80).

Пры падлічцы галасоў старшыня павінен кожную картачку голасна прачытаць, а **номэр сьпіска і картачку паказаць давераному ад грамадзянства**.

Адным словам, бачым якая важная роля даецца законам гэтым давераным ад грамадзянства.

Разумеецца што ані выбаршчыка, ані давераного ад грамадзянства урадовая адміністрацыя ня мае права крануць, калі яны ня выходзяць з рамаю закону.

Але самую цяжкую праступнасьць зробіць той прадстаўнік улады ці грамадзянін, які адважыцца крануць асобу давераного ад грамадзянства, абавязкі якога паказаны ў выбарным законе, дзе забэзпечываюць яму асобую апеку ад закона так, як і сябрам Абводавых Камісій [ст. 27).

З усяго вышэйсказанага, бачым, як важна і неабходна мець гэткія камітэты ў кожным абводзе, як важна раней падгатаваць ня менш як трох асоб у абводзе. З гэтых гатовых і ведамых Акруж. Камітэту трох камітэцкіх асоб паўнамоцнік нашага акружнага сьпіску назначае давераного ад грамадзянства і яго заступніка, як толькі будзе пададзены нам сьпісак.

Пасьля назначэньня іх, яны ўжо лічацца недатычнымі. Кожны давераны ад грамадзянства маець права ад сябе вызначыць па аддзельных вёсках сваіх даверанных, якімі зьяўляюцца і ўсе другія сябры Абводавага Беларускага К-ту.

Вызначайце-ж сваіх верных людзей—сваіх давераных ад грамадзянства!

Закладайце свае Камітэты ў кожным абводзе!



Перад выбарамі.

Зьмены ў Выбарным Законе.

Тэрмін выстаўленьня сьпіска выбаршчыкаў для агляду і паправак перанесены іншча на нядзелю. Апошнім дзень падачы заяў (рэклямацый) аб унясеньні ў сьпісак незапісаных не 28 верасьня, як гэта было назначана, а 5 кастрычніка.

Прадвыбарны зьезд у Бельску.

— У Бельску 21 верасьня адбыўся акружны зьезд выбаршчыкаў беларусаў. Вынесена пастанова аб далучэньні да Беларускага Цэнтр. Выбарнага К-ту.

Прадвыбарная „свабода."

— У Вялейцы паліцыя зрывала абвесткі аб беларускім мітынгу, які адбыўся 24 верасьня, расклееныя агітатарамі Бел. Цэнт. Выб. К-ту. На гэтым мітынгу быў арыштаваны і хутка выпушчаны селянін Гальяш Наркевіч з вёскі Альшына за тое, што агітаваў за беларускі сьпісак.

— Вучыцель Балінскі агітатар Акруж. Горадзенскага Белар. Кам. быў арыштаваны ў м. Індуры Горадзенскага павету і пасаджаны ў вастрог у Горадні. Дзякуючы захадам Акруж. К-ту Балінскага звольнілі і калі ён, вяртаючыся ў м. Індуры, агітаваў па дарозе, дык ізноў быў арыштаваны і неўзабаве ўсёткі звольнены.

Пад номярам 16 аб'едналіся ўсе пакрыўджаныя народы ў Польшчы. У грамадзе—сіла!

Воля і лад у нашых руках!

Як пасцелімся, так і высьпімся.

Закон аб выбарных сходах.

5 жніўня Сойм зацьвярдзіў закон, які дае поўнаю свабоду рабіць перадвыбарныя сходы. З прычыны таго, што эндэцкая адміністрацыя, варожая да беларускага насяленьня, будзе рознымі спосабамі прашкаджаць беларускай перадвыбарнай агітацыі, лічучы, што народ на вядае сваіх правоў, — мы даем тут поўнасьцю гэты закон:

Арт. 1. Дзеля ўсіх сходаў, якія склікаецца выбаршчыкамі, ці кандыдатамі на дэпутатаў у выбарным часе, значыць, ад дня вызначэньня выбараў **пазваленьне адміністрацыйнае улады непатрэбна.**

Арт. 2. Аб перадвыбарным сходзе **пад адкрытым небам** на плошчах публічных дарогах асоба, якая той сход склікае, павінна **заявіць** адпаведнай адміністрацыйнай уладзе 1-е інстанцыі або найбліжэйшым паліцэйскім вартам (posterunkom policyjnym) ня менш як за 24 гадзіны да пачатку сходу.

Арт. 3. Заява, аб якой кажа арт. 2, можа быць зроблена на пісьме або на словах і павінна зьмяшчаць у сабе: 1) імя і прозьвішча таго, хто склікае сход, 2) паведамленьне, што гэта ёсьць перадвыбарны сход, 3) адрэс таго, хто склікае. **Улада ўраз-жа выдае пасьведчаньне,** што заява аб сходзе зроблена.

Арт. 4. Памянутыя ў арт. 3 заява і пасьведчаньне вольныя ад усялякіх гэрбавых аплат.

Арт 5. Гэты закон ні ў чым **ня зьвязывае сходаў у закрытых памешканьнях,** пры чым падворак і садок, якія становяць арганічна зачыненую цэласьць з гмахам, лічацца закрытым памяшчэньнем.

Арт. 6. Усе пастановы ранейшых загадаў, нязгодныя з гэтым законам, губляюць сілу закона.

Арт. 7. Гэты закон атрымлівае сілу ад дня абвешчаньня яго, а выпаўненьне яго даручаецца Міністру Унутраных спраў.

Такім парадкам, згодна з гэтым законам (Ustawa w sprawie wolności zgromadzeń przedwyborczych z dnia 5 sierpnia 1922 г.) у перадвыбарным часе (значыць пачынаючы ад 18 жніўня да дня выбараў) можна свабодна, нікога ня пытаючыся і не паведамляючы, склікаць перадвыбарныя сходы ў закрытых памяшчэньнях. Таксама ня трэба прасіць ні ў каго пазваленьня на скліканьне сходу на рынку, плошчы, вуліцы, дарозе, а аб такім сходзе проста трэба паведамляць паліцыю загадзя—за 24 гадзіны.

Ведама, паліцыя, лічучы на цемнату народу, можа памыкацца абыйсьці закон,—прыкл., можа адмовіцца прыняць заяву аб сходзе. Гэта—незаконна, і ў такім выпадку пры падачы заявы трэба мець некалькі сьведкаў, што паліцыя паведамлена аб сходзе.

Карыстайцеся гэтым вашым правам і пазывайцеся на гэты закон.

Чытайце, распаўсюжывайце і шануйце сваю газэту.

Ратуйце каапэрацыю!

Хоць увага ўсіх зьвернута цяпер на выбары ў Сойм, нам беларусам ня можна ні на адзін мамэнт забывацца аб другім паважным фактары ў культурна-грамадзянскім жыцьці нашага сялянства- каапэрацыі.

На жаль, увага да гэтага боку жыцьця настолькі аслабела, што можна з пэўнасьцю гаварыць аб поўным занепадзе грамадзянска-каапэратыўных інтарэсаў.

Але гэтага быць не павінна!

Гэта, для нас, беларусаў-самабойства, згуба...

Усе павінны помніць, што разьвіцьцё, або заняпад каапэрацыі ёсьць пытаньнем адраджэньня ці зьнішчэньня духоўнай і матэр'яльнай культуры нашага народу. Добра сьведчыць аб гэтым прыклад чыста сялянскіх краёў, як Данія або Фінляндыя, сялянская культура і дабрабыт якіх пабудованы выключна на моцнай падставе разьвітай ува ўсе бакі каапэрацыі. Гэта добра ведаюць нашыя ворагі, і, як мага, душаць нашую каапэрацыю.

Трэба адзначыць, што здаровай, могутнай каапэрацыі, якая бы запраўды зрабілася фундамантам народнай культуры ў нас няма, мы дагэтуль яе не стварылі.

І увесь каапэратыўны арганізм наш ад нізу да гары дужа хворы і трудна сказаць што небясьпечней, ці немач клетачак — каапэратываў, ці старчаская хваравітасьць саюзаў.

Галоўнейшай адзнакай здаровай каапэрацыі зьяўляецца яе незалежнасьць, яе самадзельнае істнаваньне на срэдствы сяброў і абслужываньне сяброўскіх патрэбаў. Усякая залежнасьць каапэратыва ці ад спекулянта, які даў на крэдыт тавар, ці ад пана-абшарніка, які пазычыў грошы — вядзе да згубы.

Але са смуткам прыходзіцца прызнацца, што ў нас вельмі рэдка трапляюцца каапэратывы, ўжо ня кажучы аб саюзах, якія стаяць моцна на сваіх нагах.

Зараза падачкі, зараза чужой помачы зародкі якой закінулі з аднаго боку „апрвізацыйныя капэратывы", а з другога „спажывецкія камуны", атруціла ўсю каапэрацыю. Зусім відавочна як марнее каапэрацыя. Таварыствы або зачыняюцца, або трапляюць у рукі людзей, якія робяць каапэратывы сваімі ўласнымі крамкамі. Тут не да павілічаньня паеў, не да прыцяганьне новых сяброў, а ўсё канчаецца на павялічаньні абароту, які дае гаспадару карысьць. Зусім ясна: каапэрацыя гіне, дых нажывы распаловіў народную арганізацыю.

Адсутнасьць каапэрацыі ў нашым краі страшэнна шкодна адаб'ецца на жыцьці беларускага народу. Нам, як нікому іншаму, патрэба гэтая школа самадзельнасьці, гэтая аддушына для жывых, творчых сіх народу. Тоські каапэрацыя навучыць нас, як стаць на шырокі шлях грамадзянскай работы. Без каапэрацыі, мы заўсегды будзем кульгавымі ў сваім развіцьці.

А калі так, дык нам ня можна дапусьціць да зруйнаваньня каапэрацыі. Калі ня хочуць каапэрацыі іншыя, дык мы беларусы, павінны яе адбудаваць.

Справа — паважная. Нам трэба пачынаць ад пачатку, ад арганізацыі моцных здаровых каапэратываў! Трэба рваць са старым, з прызвычаеньнем да панскай ласкі і пазычак і разлічаць толькі на свае сілы. Трэба ісьці ў працу ня з тым, як дагэтуль, што в каапэрацыі будзе толькі матэрыяльная карысьць—не, трэба ісьці як да грама[illegible] кай народнай справы. І трэба аканча[illegible] на кінуць усіх тых, што прымазаліся да капэрацыі.

Будаваць ад пачатку здаровыя [illegible]пэратывы могуць толькі здаровыя, [illegible] евыя людзі, і такіх людзей мусіць [illegible] наша вёска.

Ведама, на вёсцы ёсьць каап[illegible]тыўныя працаўнікі, якія шмат папр[illegible]валі ў каапэрацыі, калі не ў сябе [illegible] бацькаўшчыне, дык на чужыне.

Ёсьць проста каапэратыўныя ра[illegible]нікі, поўныя сьвядомасьці і глыбо[illegible] разуменьня каапэрацыі, але яны чам[illegible] ці сядзяць на сваіх вёсках, а каап[illegible]цыю робіць пан-абшарнік, духоўны[illegible] насоценец „крэсовы" хлопчык-інстр[illegible]тар, або гістарычная кабета-агітата[illegible].

Зразумела, што акрыч ашук[illegible]ства і разладу гэтыя людзі нічога не [illegible]дуць народу. Дык ня трэба, каб спа[illegible] нашы творчыя сілы.

Беларусы, закладайце Выбарныя Камітэты, станьце у абароне сваіх правоў!

Усе, ў кім жыве жаданьне працы на грамадзянскай ніве, у кім жыве жаданьне палажыць сілы на службу народу, павінны ісьці ачысьціць нашу каапэрацыю ад шкодных нездаровых элемэнтаў, павінны зрабіць яе чыстай народнай справай.

Вёска мусіць выпхнуць усе свае жывыя сілы на працу, каб закласьці першыя моцныя цаглінкі—каапэратывы.

Але гэтага мала, нам трэба зьвязацца, трэба аб'яднацца.

Нам патрэбна стварыць сваё ідэёвае аб'яднаньне, незалежнае ад якіх бы там ні было сучасных арганізацый атручаных духам разладу.. Няхай такі гурток не ставіць сабе жадных практычных мэтаў, няхай гэта будзе — толькі аб'яднаньне ідэёвых беларускіх каапэратараў, якое бы на на першых парах хоць духоўна еднала нашых раскіданых па вёсках ідэёвых сяброў, каб выкрысталізовывала беларускую каапэратыўную думку і волю.

І тады- -маючы моцныя каапэратыўныя адзінкі на мейсцох і ідэёвае адзінства ўсіх жывых сіл каапэрацыі можна будзе падумаць аб закладзінах высокага, моцнага каапэратыўнага будынку, у сьветлых пакоях якога мог бы далей разьвівацца і ўмацовывацца дух і культура нашага народу.

І. А.

Нота паўнамоцнага прадстаўніка РСФСР у Літве да Літоўскага ураду.

Пану Юргуцісу, міністру чужаземных спраў Літоўскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

Высокапаважаны пане міністр!

Расейскаму ўраду стала ведома, што да літоўскага ўраду паступіла прапазыцыя галоўных хаўрусных і асоцыіраваных дзяржаў прыняць пастановы Вэрсальскага трактату датычна ракі Нёмна. Дзеля гэтага лічу абавязкам давесьці да вашага ведама, што Расейскі ўрад ні ў якім выпадку ня можа дапусьціць таго ці іншага разьвязаньня пытаньня аб рацэ Нёман без свайго ўдзелу і ў кожным разе будзе прызнаваць неабавязковымі дзеля сябе такія пастановы, якія аб гэтым пытаньні могуць быць прыняты.

Міжнародны характэр ракі Нёман устаноўлены яшчэ больш ста год таму назад 14-м артыкулам актаў-Венскага кангрэсу, якія маюць пад сабой подпіс Расеі, адчынілі плаваньне па рацэ Нёмну для ўсіх жыхароў бышай кангрэсавай Польшчы.

Расейскі ўрад заўсягды цьвёрда трымаўся таго погляду, што ніякія міжнародныя акты, якія былі ў сваім часе падпісаны пры ўдзеле Расеі, ня могуць быць зьменены без таксама-ж удзелу Расейскага ўраду. Гэта я лічу патрэбным у поўнай меры пацьвердзіць у зьвязку з цяперашняй справаю.

Што належыцца да сучаснага становішча Нёмна, як яно выраш[а]на ў Вэрсальскім трактаце, то Расейскаму ўраду зусім усё роўна, — ці доля Нёмну будзе выражана згодна належных артыкулаў Вэрсальскага трактату, ці можа, Нёман, згодна заяве, зробленай на Барцэлёнскай канфэрэнцыі літоўскім дэлегатам, панам Сідзікаўскас, пасьледуе рэжы[му] устаноўленаму для міжнародных рэк Барцэлёнскай канфэрэнцыі.

Расейскі ўрад ня можа зараз выка[заць] свае думкі на карысьць той ці ін[шай] з гэтых двох альтэрнатываў, бо пы[таньне] гэтае ва ўсёй яго цэласьці, бязу[моўна], павінна будзе разглядацца ўсімі [зацікаўленымі] дзяржавамі, не выключа[ючы] і тых дзяржаў, на тэрыторыі якіх [знаходзіц]ца пачатак прытокі ракі Нёмана, [ці] яго пачаткаў, асабліва Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі, так[сама] павінна мець магчымасьць выказаць [свой] погляд на гэтае пытаньне, — я, [трымаючыся] да сказанага ў пачатку мае[га ліста], рашуча пратэстую ад імя майго [ураду] проціў усякага разьвязаньня пытаньня аб Нёмне бяз ўчасьця Расеі і Беларусі.

Прыміце, пане міністр, завярэньні [м]аім глыбокім паважаньні.

Паўнамоцны прадстаўнік РСФСР у Літве ДАУЦЯН.

Маленькі фэльетон.

Два соймы.

Прадгуканьне.

З прычыны бесканечных адкладаў конкурса на сцэнічныя творы ў Музыкальна-Драматычным Гуртку, я, згубіўшы цярплівасьць, змушаны аддаць сваю пьесу ў „Беларускі Звон".

Абраз першы.

Дзеецца ў Вільні ў лютым м-цу 1921 г. у адным з пакоеў „дыгнітажа". За сталом у мягкім крэсьле сядзіць сам „дыгнітаж"— важны чын.

Важны чын. Так. Для польскай заграмічнай палітыкі важна, каб у Віленскі Сойм прайшлі дэпутаты ад усіх меншасьцяў. Хай Эўропа знае, што пад Польшчу ўсе народы гвалтам лезуць. Канешна трэба зрабіць так, каб у Віленскім Сойме былі Беларусы, Жыды, Літвіны, Расейцы... Ух, як іх шмат! Ну, але як улезуць, дык праз 50 гадоў будуць палякамі ха-ха-ха. Залатыя словы ха ха-ха... Ужо мы іх пераxвабрыкуем, (звоніць, уваходзіць з нізкім паклонам кіраўнік кіраўнікоў.) Як з выбарамі? Жыды ідуць?

К. к. Пасля гутаркі з доктарам Выгодзкім можна быць пэўным, што...

В. ч. Ідуць?!

К. к. Што ня пойдуць.

В. ч. Таксама і літвіны?

К. к. І літвіны.

В. ч. І расейцы?

К. ч. І яны. Вось маю клопат з беларусамі.

В. ч. Які клопат?

К. к. Ня еднаюцца каля „Еднасьці". Каб іх як пагадзіць, дык мелі-б хоць беларуса ў Віленскім Сойме.

В. ч. А які бок дужэйшы?

К. к. Безумоўна наш, каля „Еднасьці", тут большасьць.

В. ч. Добра. На меншасьць у нас знойдзецца ўправа. Дзякаваць Богу практыку ўжо маем. Праўда? ха-ха-ха...

Заслона.

Абраз другі.

Дэкарацыя тая самая. Важны чын рупна ходзіць па пакоі. Стук у дзьверы.

В. ч. Ды ўваходзь жа? хутчэй... (уваходзіць К. к.) Ну як? кажыце? Вынікі выбараў?

К. к. Горш як дрэнна. Нават тыя, хто ішоў за намі, гэтае быдла, беларусы...

В. ч. Большасьць ці меншасьц?

К. к. Большасьць!

В. ч. Як? І яны ні аднаго пасла?

К. к. Яшчэ горш. Бадай зусім не галасавалі.

В. ч. Ага, калі так дык іх трэба распыліць, каб і сьледу ня было...

К. к. Выслаць у Літву.

В. ч. Каб іх голасу ня чуць...

К. к. Газэты, школы зачыніць.

В. ч. Каб іх...

Заслона.

Абраз трэцьці.

Дэкарацыя тая самая. Жнівень 1922 г. За сталом у задуме важны чын.

В. ч. Охо-хо... Усе ідуць... Як саранча паядуць усе нашыя пасевы. Бяда. Беларусы, Украінцы, Расейцы, Стараверы, Жыды, Немцы усе як адзін прыцца на польскую ніву. Сапраўды я ўжо раблюся бальшавіком і перастаю верыць у заборчую палітыку. Так жа цяжка змагацца. Уся гэтая меншасьць можа запанаваць над намі большасьцяй у Сойме. Вось будзе скок! Не, здавацца сорам! „Од можа до можа!" (звоніць).

К. к. (уваходзіць). Гатоў на ўслугі.

В. ч. Як з выбарамі?

К. к. Усе, хто не паляк зхаўрувіўся у Блёк. Закладаюць камітэты, арганізуюцца, шумяць. Усе «Крэсы» устаюць, пацягіваюцца, дышаць. Страшна! Я ужо самачынна зрываю вывескі, арыштовываю, пужаю, угражаю, састаўляю сьпіскі агітатараў...

В. ч. Добра, добра... Адным словам рабіце так, каб ні аднаго іхняю пасла ня было ў Сойме. І на усякі прыпадак прырыхтуйце на Лукішках шмат мейсца.

К. к. Росказ!

Заслона.

(Канец будзе пасьля выбараў).

Кій.

16.

Да выбараў, сяляне,
Рыхтуйцеся ураз,
Каб не пашоў на марна
Так важны час для вас!
Каб імя Беларуса
Грымела-б, як грымот,
Каб жыў багата, вольна
Сялянскі наш народ.
Каб родная зямелька
Дасталася бы нам,
А не чужым жаўнерам,
Абшарнікам—панам.
Каб родная асьвета
І мовы роднай гук
Па вёсках разыйшліся
Свабодна, бяз прынук.
Хто-ж дасьць нам усё гэта,
Пазбавіць нас ад бед?—
Наш родны Беларускі
Цэнтральны Камітэт!
Ідзём жа ўсе, браточкі,
На моцны кліч яго,—
16 давядзе нас
Да шчасьця сваяго.
Пад номярам шаснаццатым
Беларусы ідуць
І з Сойму лепшу долю
З сабою прынясуць.
Ад зьдзеку, крыўды, гора
Нас будуць бараніць
І аб зямлі старацца,
Хутчэй каб раздяліць.
Дык вось, браты—сяляне,
Ня йдзіце да чужых
Бо номер наш шаснаццатый
Ён лепшы за другіх.
Калі за гэты номяр
Пачнем галасаваць,
Дык паляпшэньня долі
Нядоўга нам чакаць!

Зьмітрок.

Прагаласаваць за № 16 тое самае, што сказаць: годзі крыўды!

Якіх нам трэба вучыцялеў?

У 1870 г. была вайна французаў з немцамі. Скончылася яна вельмі нешчасьліва для Францыі, адкрыўшы перад усім сьветам многія яе слабасьці. Што было прычынай, чаму шчасьце так цьвёрда трымалася сьцягаў нямецкіх? Вучоны, якія глыбей удумаліся ў тагочасны стан Францыі і Нямеччыны, прышлі да вываду, які коратка выражаецца ў гэтай вядомай у палітыцэ форме: у 1870 г. нямецкі вучыцель перамог французкага!

Перад народам беларускім стаіць, як заданьне найбліжэйшых гадоў, выіграць вялікі, сьвяты бой. Бой гэты будзе некрывавы — нат' ня дзеля граніц багацьця нашай зямелькі, — будзе ён ісьці сярод нас, ён будзе ў абароне нашай самабытнасьці, дзеля захаваньня нашай беларускай народнай душы і разьвіцьця нашай беларускай мовы. І раней таго, каб крыкнуць: **рукі проч!** да тых, што нас рупяцца перарабіць па свойму, мы маемо зваеваць ворага ўнутраннага, які моцна ад вякоў засеў у глыбіні нашай душы, ў самай сэрдцавіне нашай народнай масы. Гэтым унутранным ворагом ёсьць тая бесканечная санлівасьць, бязвольле, тупасьць мысьлі, якую мы бачым там, дзе толькі жыве беларус. Дзеля гэтага беларус часта ёсьць хутчэй рэчай, чым жывою асобай, чалавекам.. Народ наш стаўся на сваей адвечнай зямельцы таварам, які купляюць і прадаюць, перарабляюць і псуюць на ўсе лады, прышоўшыя купцы, гандляры, спэкулянты.., І ўсе яны дужа часта нас надта многа хваляць. Але ведаймо, хто нас найбольш хваліць, той часта найбольш нас выкарыстывае. Нас хваляць датуль, покуль могуць з нас карыстаць, і перастаюць хваліць зараз у тую-жа мінуту, як мы прабуемо быць толькі **самымі сабой!** Трэба ўдумацца ў фальшывасьць гэтай хвалы.

Дык хтож мае перад усім аб'явіць крыжовую вайну гэтай нашай немарасьці, санлівасьці, бязвольнасьці... калі не **беларускі народны вучыцель?**

Вотжа беларусам раней усяго патрэбны беларускія народныя вучыцялі і вучыцелькі. Яны могуць, найбліжэй і найчасьцей жывучы з нашай народнай масай, біць бязупынна, як молатам, сваей ахвярнай працай і адвечную сьцяну тэй цемры і крыўды, якія грозна павісьлі над нашай вёскай.

І ў адраджэньні беларускага народу вучыцельства школ пачатковых па вёсках важнейшае нат' мае заданьне, чым вучыцельства школ сярэдніх у гарадох.

Бязмала ад 1916 г. пачалася прыгатаваўчая праца, каб вышкаліць добрых змагальнікаў беларускай прасьветы. І сапраўды беларускае вучыцельства істнуе і працуе. Дзякуй Богу! Аднак не маглі мы тут устрымацца, каб ня выразіць жу[р]аснага суму з тэй прычыны, што, як здаецца, няма ішчэ сярод нашага вучыцельства працаўнікоў, якія ўжо вырасьлі б на цэлую галаву вышэй ад звычайнага вучыцеля. Народ, які хоча адрадзіцца, патрабуе вучыцельства асаблівага тыпу. Людзі звычайныя нашага сялянства здаволіць ня змогуць. Вучыцялі звычайныя — добрыя там, гдзе жыцьцё ўжо нармальнае.

Вялікі, сьвяты бой за адраджэньне беларускага народу мусіць выграць наш беларускі вучыцель.

Калі ён выйграе, народ наш будзе жыць. Калі ж не, народ наш сваей душы народнай доўга ня знойдзе.

Вінцук Нёманскі.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Мяст. Турэц, Навагр. пав.

У мяст. Турэц Навагрудзкага павету прыехаў з Белар. Навагрудз. Акруж. Выб. К ту агітатар студэнт Амельяновіч і склікаў мітынг. На мітынгу была і месцовая паліцыя. Калі гр. Амельяновіч залажыўшы К-т выехаў у Навагрудак, дык месцовая паліцыя у поўным вааружэньні з мэтай напужаць жыхароў пачала шукаць гр. Амельяновіча у сяброў к-ту. Шукалі пад печай, у скрынях, на гарэ хат не зважаючы на тое, што ім усе казалі куды паехаў агітатар.

М. Маладэчына, Вялейскага пав.

Прышоў час, калі ўсе беларусы мусяць паказаць усяму сьвету, што яны ёсьць і хочуць жыць, як і другія народы, а ня быць „быдлам". Прышоў час аб'еднацца у вялікі саюз без рознічча ў поглядах, бо толькі ў гэтым аб'еднаньні і ёсьць наша моц. Бо і ворагі нашыя ня сьпяць. Яны спакушаюць наш народ пад разнымі маскамі; яны кідаюць гразь на нашых лепшых людзей; яны дужа многа абецаюць, але нічога нядалі і нічога не дадуць. Такія птушкі з'явілісь і ў нас ў Маладэчне Першымі прыляцелі „арлы" з „Вызваленьня". Яны так добра гаманілі, ды яшчэ па нашаму, па беларуску, так лоўка пералічалі нашыя балючкі, што выглядалі як бы прыяцелямі сялянства. Але хутка мы дазналіся, што яны ж, як і другія польскія партыі, галасавалі, каб аддаць нашу зямлю, палітую потам і крывей нашых дзядоў, жаўнерам польскім; яны ж далучалі Віленшчыну да Польшчы. Адным словам памагалі нам, як кашаль хваробе.

Пасьля зляцелася рознае груганьнё як людоўцы, пястоўцы, а нават прыкульгалі і неякія „зяленадубцы", але наш селянін стаіць, як сьцена за сваё роднае і ўся гэтая дробезь, як гарох ад сьцены паадскаківалі.

Партыі гэтыя стараюцца разьбіць нашу еднасьць, яны працуюць на ка-

Беларуская інтэлігенцыя, сяляне і работнікі, рыхтуйцеся да выбарау, трэбуйце, каб незапісаных запісывалі у сьпіскі выбаршчыкау!

рысьць нашых ворагоў. Сяляне-браточкі! Ня верьце гэтым людзям, бо яны, каб разьбіць нас на малыя часткі і не даць магчымасьці правясьці паслоў у Сойм, могуць і яшчэ прыдумаць з дзесятак партыяў, якія будуць абецаць рэкі з кіселя і меду якія будуць да вас пячы яшчэ пяць гадоў аж да новага Сойму і так не дацякуць.

Гуртуйцеся, грамадзяне, усе каля Беларускага Цантральнага Выбарнага Камітэту. Толькі аб'еднаўшыся каля яго і згаварыўшыся з другімі пакрыўджанымі нацыямі, мы даб'емся сваіх правоў.

Маладэчанец.

М. Браслаў.

У нашага паветовага старасты абшарніка Мікуліча - Радэцкага гасьціў з Латвіі якісь пан, які закупіў шмат мануфактуры. І вось каб яе адправіць у Латвіі староста загадаў у Браслаўскую гміну каб прыслалі две падводы. Калі прыехалі падводы стараста і яго госьць расселіся на аднэй падводзе, а скрыні з мануфактурай узвалілі на другую. Гаспадар гэтай падводы Хлябовіч заявіў, што яго конь няўждужае такі воз пацягнуць, за што староста ударіў яго па твары. У дарозе конь Хлябовіча правалі́ўся на гнілым масьце, скалечыўся і чуць давалокся да хаты дзе неўзабаве здох. Гета адбылося ў самы рабочы час, селянін пабіты, зруйнованы, ойкаючы перабіваецца з дня на дзень, а яго крыўдзіцель безнаказна і далей кіруе сваім паветам. Адна надзея на выборы ў Сойм, калі выбярам сваіх людзей.

Антось Беларус.

Беларус! Перад галасаваньнем успомні сваю мінуўшчыну.

ХРОНІКА.

Небывалы зьдзек. У Радашковічах Вялейскага павету Беларускае Таварыства Школы пасьля безупынных просьбаў і цяжкага вмаганьня з рознай фармалістыкай польскіх устаноў і перашкодамі, вымантачыла ўрэшце канцэсію на Беларус. гімн. Нанялі памешканьне, сабралі мэблі. Але няўзабаве школьны інспэктар адняў мэблі, а памешканьне заняла паліцыя. Праз нейкі час Белар. гімназія наняла дом, але і тут доўга не пасядзела—штаб 30 батальёну польскіх войск, не зважаючы на пратэсты, разгнязьдзіўся ў доме і гімназія зноў апынулася на вуліцы. Урэшце гэтай восеняй на запрацаваныя селянскія грошы ўдалося раздабыць памешканьне і ўсе школьныя прылады. Запісалася шмат акалічнай моладзі, зьехаліся вучыцялі і пачаліся заняткі,—загарэлася вогнішча роднай асьветы. Перапалохаліся паны! І пусьцілі ў ход сваю паганую моц—виганяюць цяпер Беларускую гімназію з трэцьцяга прыставішча, каб туды памясьціць свой выбарны камітэт. Во хто агітуе за наш беларускі сьпісак, бо які-ж ачумеўшы, пасьля ўсяго гэтага, пойдзе галасаваць за польскую партыю.

Прадвыбарны сход. Беларускі Цантральны Выбарны Камітэт скікае ў нядзелю 1-га кастрычніка ў залі Драматычнае Майстроўні Вострабрамская 9, сход беларусаў. Пачатк а 12-ай гадзіне. Мэты сходу—прадвыбарныя справы.

У Белар. Цантр. Выбарным К-це. ((Віленская № 12.) Буйна ідзе перадвыбарная праца. Кожны дзень дэлегаты з вёсак робяць даклады з месц і скваппа набіраюць літэратуру. Вёска ажыла, зацікавілася, паверыла. Камітэт працуе цэлы дзень. Сябры камітэту, якія маюць яшчэ службовыя заняткі, выбіваюцца з сіл. Паседжаньні зацягіваюцца да глыбокай ночы. Хоць шмат друкуецца адозваў, інструкцыяў, газэт («Беларускі Звон» і „Кгупіса") аднак незаўсёгды ўсім хапае. У агітацыйнай працы гарачае ўчасьце прыймаюць студэнты-беларусы.

Аб конкурсе сцэнічных твораў. Дзеля таго, што на Конкурс паступіла даволі значная колькасьць пьесаў, а сябры Конкурснае камісіі ў сучасны момэнт заняты іншай працай і ня маюць часу на разгляд п'есаў, выдача прэміеў адкладаецца да 1-га сьнежня г. году і гэтак сама працягіваецца тэрмін паступленьня новых пьесаў да 1-га лістапада.

Маладое Жыцьцё. На днях выйдзе часопісь беларускай моладзі «Маладое Жыцьцё» № 3 (6).

Беларускі шлюб. 29 верасьня ў касьцеле сьв. Мікалая ў 6 гадз. веч. адбыўся шлюб беларускай паэткі Арсеньевай з вядомым беларусам п. паручнікам Ф. Кушалем. Рэдакцыя „Бел. Зв." гэтай маладой беларускай пары выражае сваё найшчырэйшае пажаданьне усяго найлепшага ў новым жыцьці.

Раз'ясьненьне.

Беларуская Цантральная Школьная Рада ў Вільні гэтым даводзіць да ведама сялян беларусоў, што яны, хочучы адчыніць у сябе на мейсцы беларускую пачатковую школу, маюць на гэта законнае права. Гета права замацована Канстытуцыяй Рэчы Паспалітай Польскай (§ 110) маючы на увазе культурныя патрэбы сваіх грамадзян, належучых да няпольскай нацыянальнасьці.

Дзеля адчыненьня школы сяляне павінны: 1) давясьці да ведама войта гміны, што яны ў такі і такі дзень зьбяруцца ў гміне ці ў другім мейсцы на сход дзеля пастановы аб адкрыцьці беларускае школы, 2) напісаць на гэтым сходзе просьбу да Павятовага Школьнага Інспэктара з подпісамі тых бацькоў, дзеці якіх будуць вучыцца ў школе, 3) у просьбе зазначыць, што выдаткі на школу сяляне бяруць на свой кошт, апрыч аплаты пэнсыі вучыцелю і 4) дадуць сьпіс дзяцей ня менш 40. (Калі дзяцей будзе больш чым 50—60, і на гэты лік будзе адпаведаць будынак школы, то ў просьбе можна прасіць вызначыць 2-х вучыцялёў). Вучыцель, каторага сяляне будуць прасіць аб назначеньні, цавінен ведаць польскую мову і мець адпаведныя паперы на права выкладаньня ў пачатковай школе.

Копію з усіх, зробленых такім парадкам, дакумэнтаў належыць прыслаць у Беларускую Цантральную Школьную Раду, каб, на выпадак правалочкі справы адчыненьня школы, Рада магла-б яшчэ і з свайго боку падтрымаць просьбу сялян перад Уладай.

Беларуская Цантральная Школьная Рада.

Што чуваць у сьвеці.

З Балкан.

Кемаль, які стаіць на чале турэцкіх войск, заявіў, што Турцыя не прызнае нейтральнай паласы і разам з тым хоча абмінуць непажаданых вынікаў.

З Афін паведамляюць, што ў Грэцыі пачалася рэвалюцыя.

Парыжскія палітычныя кругі лічаць вельмі трывожным палажэньне на Блізкім Усходзе.

Англія атрымала ноту ад Сав. рэспублік, у якой яны дамагаюцца аб дапушчэньні Украіны, Велікарасеі і Грузіі на канфэрэнцыю по пытаньню Бл. Усхода. У зьвязку з гэтым поўдзень Расеі аб'яўлены на ваенным палажэньні.

Рэвалюцыянеры арыштавалі грэцкага Караля Канстантаго.

У Канстантынопаль прыбыло 10 караблёў з англійскай эскадры.

Растрэлы эсэраў у Расеі.

У Маскве расстрэляны бяз досьледу і суда вядомы эсэр Шышкін.

Гандлёвыя дагаворы з Савецкай Расеяй.

Францыя заключыла эканамічны дагавор з Расеяй.

У Маскву прыбыла Галяндская дэлегацыя з мэтай заключыць гандлёвы дагавор.

З Літвы.

Прызнаньне Літвы de jure

У Коўні атрымана паведамленьне, што пытаньне аб прызнаньні Літвы de jure будзе разгледацца ў Радзе Лігі Народаў 15 кастрычніка.

Літоўская Рада ў Рызе.

Літоўская калонія ў Рызе прыступіла да заснаваньня сваей Нацыянальнай Рады.

Пісьма ў рэдакцыю.

Грамадзянін Рэдактар!

Прашу надрукаваць, што я ня маючы па законах Польскай Рэспублікі выбарнага права, ніякага ўчасьця ў працы выбарных арганізацый ня прыймаў і ня прыймаю. Імя маё ў ліку сяброў Беларускага Выбарнага Камітэту зьявілася праз непаразуменьне.

Максім Гарэцкі.

Вільня,
30. IX. 1922 г.

Паважаны пане Рэдактар!

Прашу памясьціць, калі ласка, у „Беларускім Звоне", што наступае:

У „Беларускім Звоне № 19 (44) з дня 15 верасьня 1922 г. была надрукована стацьця „Самазванства".

Асьвядчаю:

Беларускі Камітэт у Варшаве, як існаваў, так і далей існуе. А калі будзе Камітэт ліквідавацца, дык, згодна статуту, будзе аб гэтым абвешчана ў газэтах.

Прыміце пане рэдактару шчырае маё паважаньне.

Лявон Дубейкаўскі.

Ад рэдакцыі. Зьмест усяго пісьма ня можа быць надрукаваны з прычыны яго нэрвовага тону. Што да Варшаўскага Беларускага К-ту, дык паўтараем, што К-т фактычна ўжо няіснуе, хоць формальна яшчэ ня зліквідованы.

Паштовая скрынка.

Мокяку М. Дзісна. Грошы атрымалі. Аб якім сяброўскім ўзносе Вы пішаце?

Адрасы Беларускіх Выбарных Каміт.

Цантральны выбарны Камтэт. Вільня, Віленская № 12.
Акружны Выб. Камітэт на Навагрудзкі акруг, Баранавічы, Паштовая № 66.
Акружны Выб. К-тэт на Лідзкі акруг Ліда, Базарная вуліца № 19.
Акружны Выб. К-тэт на Гарадзенскі акруг. Горадня, Паўночная вул. № 7.
Акружны Выб. К-тэт на Беластоцкі акруг. Ваўкавыск, Пясковая вул. № 14
Навагрудзкі Паветовы Выб. К-тэт. Навагрудак, Вялікі рынак № 14
Бельскі Паветовы Выб. К-тэт Бельск, Літоўская вул. № 30
Несьвіжскі Паветовы Выб. К-тэт Несьвіж, Альбянская вул. № 30
Слонімскі Паветовы Выб. К-тэт. Слонім Абалонь № 42
Пружанскі Паветовы Выб, К-тэт Пружаны
Стаўпецкі Паветовы Выб. К-тэт Стаўпцы.
Аўгустоўскі Паветовы Выб. К-тэт Аўгустова
Сакольскі Паветовы Выб. К-тэт Саколка
Сэйнскі Паветовы Выб. К-тэт Сэйны.
Лунінецкі Паветавы Выбарны Камітэт. Лунінец, Царкоўны заулак № 2.
Вялейскі Паветавы Выбарны Камітэт., Вялейка.
Рудомінскі Гмінны К-тэт м. Рудоміна. Віленскі павет.
Шаркаўшчызненскі Гмінны К-тэт м. Шаркаўшчына Дзісенскага павету.
Докшыцкі Гмінны Выбр. К-т. Докшыцы, Дунілавіцкага п.
Забрэскі Гмін. Выбр. К-т. м. Забрезье, Валожынскага пав.
Ганчарскі Гмін. Выбр. К-т. Вёска Ганчары, Лідзкага пав.
Беліцкі Гмін. Выбар. К-т. Вёс. Збляны, Лідцкага пав.
Орлянскі Гмін: Выбр. К-т. м. Орля Лідзкага пав.
Ржанкоўскі Гмін. Выбр. К-т. Вёс. Ракавічы Лідзкага пав.
Будслаўскі Гмінны Выбарны Камітэт Будслаў, Дунілавіцкага павету.
Негневіцкі Гмінны Выбарны Камітэт. Вёска Негневіца, Лунінецкага пав.
Шчорсаўскі Гмінны Выбарны Камітэт. Вёска Шчорсава, Лунінецкага пав
Любчанскі Гмінны Выбарны Камітэт. Вёска Любчаны, Лунінецкага пав.
Уселюбскі Гмінны Выбарны Камітэт. Вёска Уселюбы, Лунінецкага пав.
Городэчэнскі Гмінны Выбарны Камітэт. Вёска Городэчна, Лунінецкага пав.
Кашэлеўскі Гмінны Выбарны Камітэт. Вёска Кашэлева, Лунінецкага пав.
Лістападзкі Абводавы Выбарны Камітэт. Вёска Лістапады, Ашмянскага павету.
Запрудзкі Абвадовы Выбарны Камітэт. Вёска Вялікае Запрудзьдзе, Ашмянскага павету.
Кашчэлічскі Абвадовы Выбарны Камітэт Вёска Кашчэлічы, Ашмянскага павету.
Старынкаўскі Абводавы Выбарны Камітэт. Вёска Старынкі, Ашмянскага пав.
Ганьковічскі Абводавы Выбарны Камітэт. м Ганьковічы, Ашмянскага павету.
Рудзяншчынскі Абводавы Выбарны Ка-т. Вёска Рудзяўшчына, Ашмянскага п.
Высокаўскі Абводавы Выбарны Камітэт. Вёска Высокае, Ашмянскага п,
Малазапрудзкі Абводавы Выбарны Ка-т. Малое Запрудзьдзе, Ашмянскага п.
Красносельскі Гмінны Выбарны Камітэт. м. Краснае Сяло, Вялейскага пав.
Маладэчанскі Гмінны Выбарны Камітэт. м. Молодэчна, Вялейскага павету.
Ільскі Гмінны Выбарны Камітэт. м. Ілія, Вялейскага павету.
Вязынскі Гмінны Выбарны Камітэт. м. Вязынь, Вялейскага пав.
Даўгінаўскі Гмінны Выбарны Камітэт. м. Даўгінаў, Вялейскага пав.
Рабуньскі Гмінны Выбарны Камітэт, м. Рабунь, Вялейскага пав.
Іжэкі Гмінны Выбарны Камітэт. м. Іжа, Вялейскага пав.
Лебедзеўскі Гмінны Выбарны Камітэт. м. Лебедзева, Вялейскага пав.
Радашкоўскі Гмінны Выбарны Камітэт. м. Радашкавічы, Вялейскага пав.
Ашмянскі Паветавы Выбарны Каміт[illegible] Ашмяна, Жупранская 36.
Сабакінцаўскі Гмінны Выбарны Ка[illegible] м. Сабакінцы, Лідзкага пав[illegible]
Язьненскі Гмінны Выбарны [illegible] Вёска Пашніна, Дзісьненск[illegible]
Новадворскі Гмінны Выбарны Кам[illegible] Новы Двор, Лідзкага павету.
Глыбокінскі Гмінны Выбарны Камі[illegible] в. Глыбокае, Лідзкага пав.
Астрынскі Гмінны Выбарны Камі[illegible] м. Астрына, Лідзкага пав.
Шчучынскі Гмінны Выбарны К[illegible] м. Шчучына, Лідзкага пав.
Пагостскі і Іодзкі Гмінны Выбар[illegible] Пагост, Дзісьненскага пав.
Слабодзкі Гмінны Выбарны К[illegible] Браслаўскага пав.

Рэдактар-Выдавец Ф. АЛЯХНОВІЧ.

Друкарня „ДРУК" Субач, 2.